6. Иванов, В. В. Практика авангарда и теоретическое знание XX века. Избранные труды по семиотике и истории культуры. – Т. 4: Знаковые системы культуры, искусства и науки / В. В. Иванов. – М.: Языки славянских культур, 2007. – С. 345-347.
7. Игнатьев, М. Б. Кибернетическая картина мира. Сложные киберфизические системы: учеб. пособие / М. Б. Игнатьев. — СПб.: ГУАП, 2014. — 472 с.
8. Короленко, П. В. Золотое сечение и самоподобные структуры в оптике / П.В. Короленко, Н.В. Грушина. – М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2010. — 136 с.
9. Сороко, Э. М. Культура как антиэнтропийный процесс: гармонизация разнообразия. Системные исследования культуры / Э. М. Сороко. – СПб.: Алетея, 2009. – 604 с.
10. Тимердинг, Г. Е. Золотое сечение / Г. Е. Тимердинг. – М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2009. – 112 с.
11. Чернавский, Д. С. Синергетика и информация: динамическая теория информации / Д.С. Чернавский – М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2009. – 304 с.

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ МАТЫВЫ Ў СУЧАСНАЙ МОДЗЕ

# TRADITIONAL BELARUSIAN MOTIVESIN MODERN FASHION

Т. Д. Рабец
T. D. Rabets

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтв
Мінск, Беларусь
Belarusian State University of Culture and Arts
Minsk, Belarus
*e-mail: rabez72@mail.ru*

---

У артыкуле дадзена характарыстыка асаблівасцей традыцыйнага беларускага адзення, вызначаны асноўныя напрамкі ў мадэліраванні сучаснага адзення на аснове элементаў беларускага нацыянальнага касцюма.

*Ключавыя словы:* мода; этнічны стыль; беларускі нацыянальны касцюм; вышыўка; арнамент; стылізацыя.

The article reveals the characteristic features of the Belarusian traditional clothing, as well as the main directions in contemporary modeling based on the Belarusian national costume elements.

*Keywords:* fashion; ethnic style; Belarusian national costume; embroidery; pattern; stylization.

Нішто так не звязана з жыццём чалавека, з асаблівасцямі яго побыту і культуры, як адзенне. Нягледзячы на тое, што першапачаткова адзенне выступала толькі як сродак абароны чалавека ад уздзеяння навакольнага асароддзя, яно на працягу ўсёй гісторыі грамадства адлюстроўвала і па-ранейшаму адлюстроўвае змены эстэтычных ідэалаў, грамадскага густу, нацыянальную самабытнасць. Па дэталях традыцыйнага касцюма, яго кампазіцыйнаму і дэкаратыўнаму афармленню можна вызначыць пол і ўзрост чалавека, яго сямейнае і сацыяльнае становішча, месца жыхарства. Асноўнымі носьбітамі названых прыкмет з'яўляюцца ўзорыстае ткацтва і вышыўка. Менавіта яны пераўтвараюць утылітарныя прадметы адзення ў вырабы дэкаратыўнага мастацтва, робяць іі своеасаблівымі і прыгожымі.

У цяперашні час развіццё моды ўсё больш і больш паскарае свой тэмп. Змены тэндэнцый у модзе адбываюцца значна часцей, чым 20-30 гадоў назад. З кожным новым сезонам дызайнеры здзіўляюць нас новымі формамі, прынтамі. Мода становіцца эклектычнай. Шматстайнасць стыляў, форм, фасонаў дае сучаснаму чалавеку велізарны выбар для фарміравання свайго індывідуальнага стылю.

Выкарыстанне этнічнага стылю, які набывае ў апошнія гады вялікую папулярнасць, дазваляе сучаснай модзе захаваць арыгінальнасць, самабытнасць, яркасць. Так, напрыклад, знакамітыя дамы моды, такія як OSKAR DE LA RENTA, KENZO, ETRO, ROBERTO CAVALLI, JEAN PAUL GAULYIER і інш., надзейна замацавалі этнічныя ноткі ў сваіх сучасных калекцыях. Фальклорная тэма загучала нават там, дзе яе, на першы погляд, і быць не павінна. Напрыклад, фальклору знайшлося ганаровае месца нават ў досыць жорсткай і мінімалістычнай калекцыі Стэфано Пілаці для Yves Saint Laurent, які скраіў раскошную сялянскую блузу не то ў рускім, не то ў балканскім стылі.

Нельга не заўважыць, што беларускія жаночыя касцюмы з элементамі этнічнага стылю ўвесь час цэняцца за якасць, якая зарэкамендавалася сябе далёка за межамі Беларусі. Адзенне з Беларусі лічыцца эталонам моды і стылю, а новыя беларускія калекцыі атрымліваюць найвышэйшыя ўзнагароды на міжнародных конкурсах і выставах.

Асобна варта сказаць пра беларускі трыкатаж, які набыў сапраўды сусветную папулярнасць. Натуральны склад і своеасаблівая структура трыкатажнага палатна, шматстайнасць адценняў, жаночыя сілуэты, магчымасць ствараць сучасныя ансамблі практычна любога памеру,

максімальны камфорт у працэсе нашэння, прыгожыя вышыўкі – гэта толькі малая частка яго вартасці.

У сувязі з тым, што этнічны стыль – гэта невычарпальная крыніца натхнення, з яго дапамогай сучасныя дызайнеры могуць ствараць розныя па сваёй сэнсавай нагрузцы вобразы: асляпляльныя або таямнічыя, мяккія або дзёрзкія. Пры гэтым любы касцюм з нацыянальнымі элементамі становіцца поўным адлюстраваннем агульнага характару нацыі, яе станаўлення і развіцця, асаблівасцей побыту і навакольнай прыроды.

Усе ідэі мастакі чэрпаюць з нацыянальнай гісторыі, традыцый, ствараючы асаблівую філасофію адзення. Фальклор здольны ўзбагаціць паўсядзённы вобраз любой сучаснай дзяўчыны, пры гэтым у такім адзенні яна не будзе здавацца старамоднай. Але гэта залежыць ад майстэрства дызайнераў, якія ўмела выкарыстоўваюць тое, што было падаравана гісторыяй. Стварэнне калекцыі, якая будзе моднай і пры гэтым захавае самабытнасць нацыянальнага касцюма, патрабуе ад дызайнераў не толькі разумення сучасных тэндэнцый моды, але і наяўнасці прафесійных навыкаў стылізацыі, а таксама глыбокіх ведаў у вобласці народнай сімволікі. Так напрыклад, кожны дызайнер павінен ведаць, што традыцыйная беларуская вышыўка першапачаткова выконвала медытатыўную і магічную функцыі. Семантычны змест мелі і тэхналогіі выканання швоў. Арнаменты і тэхналогіі вышыўкі служылі своеасаблівым спосабам захавання ведаў і ўменняў. Уся культура была накіравана на захаванне і трансляцыю жыццёва важных ведаў, якія неабходна было перадаць нашчадкам. У такім спосабе захавання інфармацыі было важна не перапыніць перадачу традыцыі. Рамяство вышыўкі і арнаменты перадаваліся з пакалення ў пакаленне ў кожнай сям'і, з'яўляліся прыкметай роду. Майстрыхі свята захоўвалі запаветы продкаў і старанна капіравалі ўзоры і тэхналогіі вышыўкі. У сувязі з гэтым дызайнеры павінны добра разумець сэнс тых сімвалаў, якія яны будуць выкарыстоўваць у сваіх мадэлях.

Нацыянальны арнамент – гэта не проста ўпрыгожванне, але і шыфр, традыцыйны набор сімвалаў і колераў, якія выкарыстоўвалі нашы продкі. У беларусаў, як ні ў кога са славян, да XX стагоддзя захавалася чысціня ўзораў – выкарыстанне толькі чырвонага колеру на белым фоне. Гэтыя колеры маюць глыбокую сімволіку. Белы фон – колер чысціні. Чырвоны – колер сонейка, крыві як сімвала жыцця, і ўвогуле сімвал жыцця. З канца XIX стагоддзя пачынае ўжывацца чорны колер, але ён ніколі не з'яўляўся асноўным, а толькі адцяняў чырвоны. У народных касцюмах яшчэ сустракаюцца сіні і жоўты колеры, але ніяк не зялёны, як прынята лічыць традыцыйным у сучасным адзенні. Усе астатнія колеры ў беларускіх арнаментах не выкарыстоўваліся.

Багацце каларыта звычайна дасягалася пры дапамозе розных арыгінальных тэхнік, у тым ліку пры дапамозе спецыяльнага размяшчэння простых дэталяў узора з іх пэўным рытмам. Усе сімвалы арнамента – вельмі моцныя знакі, якія прызначаны засцерагаць чалавека. У сувязі з гэтай магічнай функцыяй арнаменты на адзенні пераважна размяшчалі толькі на каўнярах, манжэтах, манішках, галаўных уборах, вакол твару, іншымі словамі там, дзе ёсць прарэхі, праз якія зло можа патрапіць да цела чалавека.

Яркімі характэрнымі рысамі беларускага арнамента можна назваць пераважнае выкарыстанне розных геаметрычных фігур: кругоў, зорак, ромбаў, стужак, крыжоў, ліній (прамых, зігзагападобных), шасцівугольнікаў. Раслінны матыў сустракаецца радзей і пераважна складаецца з кветак, лісця, пладоў, часцей за ўсё вінаграду. Анімалістычны матыў складаецца з выяў, стылізаваных пад жывёлу, або дэталяў яе фігур.

Галоўнай задачай дзейнасці дызайнераў з’ўляецца глыбокае вывучэнне, пераасэнсаванне сімволікі традыцыйнага нацыянальнага касцюма і стварэнне на яе аснове сучасных вобразаў, г.зн. стылізацыя. Прыкладам такога пераасэнсавання з’яўляюцца работы дамоў мод, дзе яркія ўзоры, вышыўка, каляровыя хустачкі і г.д. запазычаны з экспазіцый этнаграічных музеяў і выкарыстоўваюцца ў спалучэнні з сучаснымі формамі і матэрыяламі. Так, напрыклад, у Лідскім раённым цэнтры рамесстваў і традыцыйнай культуры «Спадчына» распрацавалі і стварылі калекцыю маладзёжнага адзення ў нацыянальным стылі з элементамі ручнога ткацтва. Галоўнай мэтай дадзенай калекцыі з’яўляецца папулярызацыя сярод моладзі народных традыцый. Перш чым узяцца за калекцыю, супрацоўнікі цэнтра вывучалі гісторыю беларускага касцюма, нацыянальную сімволіку, традыцыі, вобразы. І толькі пасля гэтага вырашылі спалучыць сучасныя матэрыялы і ручное ткацтва, вышыўку, арнамент. Гэта дало ашаламляльны эфект. Блузкі, сарочкі, спадніцы, штаны ў нацыянальным стылі атрымаліся надзвычай арыгінальнымі. У калекцыйным адзенні спалучыліся віскозныя і паўшарцяныя тканіны, лён, скура, пераважаюць белы, шэры, бежавы і чырвоны колеры. Гэта калекцыя спадабаецца і тым, хто палічыць за лепшае класічны стыль, і тым, хто прытрымліваецца спартыўнай або авангарднай моды. У любым комплексе прысутнічае нешта арыгінальнае – вышываная манішка або тканы пояс, каўнер-стойка, якія характэрны для традыцыйнага беларускага адзення. Гэта калекцыя адзення выклікала сапраўдны фурор на фестывалі «Скарбы Гродзеншчыны». Знайшліся нават людзі, якія гатовы былі купіць эксклюзіўныя экзэмпляры.

Беларускія касцюмы вылучаюцца сваёй шматстайнасцю, што ў першую чаргу звязана з іх рэгіянальнымі адрозненнямі. Касцюм кожнага рэгіёну Беларусі мае свае асаблівасці, адрозніваецца і кампазіцыйным строем, і каларыстыкай, і дэкаратыўнымі аздобнымі элементамі. Напрыклад, віцебскі касцюм адрозніваецца ад гомельскага, а мядзельскі – ад брэсцкага. Калі гэта паўднёвыя (напрыклад, гомельскі) касцюмы, то яны больш яркія, сакавітыя, чырвоны колер больш нагадвае аранжавы, а заходнія (напрыклад, гродзенскі) – заўсёды выкананы ў халодных танах: багацце блакітнага, бірузовага, ізумруднага колераў.

Пры ўсёй разнастайнасці беларускага касцюма можна вылучыць некаторыя агульныя асаблівасці, якія фарміруюць яго характар:

– *Свободны крой.* Беларускія прыгажуні заўсёды цанілі ў адзенні камфорт і сціпласць. Таму беларускі стыль прадугледжвае плаўныя лініі, жаноцкасць, прастату кроя.

– *Аздабленне маляўнічымі арнаментамі, стужкамі, тасьмой і вышыўкай.* У такім адзенні шмат яркіх колеравых і фактурных адценняў. Самымі распаўсюджанымі адценнямі з'яўляюцца чырвоны і сіні. Карыстаюцца вялікай папулярнасцю прыродныя вобразы: васількі, лён, буслы, ласяняты, мядзведзі і г.д.

– *Натуральныя тканіны.* Лён, батыст, паркаль, трыкатаж часта выкарыстоўваюцца ў вытворчасці беларускага адзення і з'яўляюцца адметнымі асаблівасцямі нацыянальнага стылю. У тканінах выразна павінны прасочвацца фактура, тэкстура, пляценне. Вялікай папулярнасцю карыстаецца лён, які сустракаецца як ў паўсядзённым, так і святочным касцюме. Напрыклад, на вяселле для дзяўчыны лёгкая ільняная сукенка ў спалучэнні з аксесуарамі ў выглядзе жывых кветак стане выдатным выбарам. Для афіцыйных мерапрыемтваў можна зрабіць выбар на карысць спадніцы і блузкі.

– *Аднатонныя тканіны.* У традыцыйным беларускім касцюме базавым колерам з'яляецца белы, але гэта не азначае, што беларускі стыль безаблічны. Шматграннасць і яркасць вобразаў ствараюць вышыўка, аздоба залатым арнаментам, тасьмой, стужкаміі г.д.

– *Выкарыстанне аксесуараў ручной работы.* Ручная апрацоўка – абавязковы атрыбут нацыянальнага стылю, незалежна ад таго, да якой народнасці ён мае адносіны. Менавіта з яе дапамогай адзенне набывае арыгінальны характар і пэўную элегантнасць.

Варта адзначыць, што беларуская нацыя заўсёды вылучалася не толькі сваёй працавітасцю, але і ўменнем адпачываць. У беларускай традыцыі так павялося, што жанчыны мелі адзін касцюм для работы, асобна адзенне для свят і нават такую, якую апраналі толькі ў пэўны

перыяд жыцця, напрыклад, толькі на вяселле або пасля нараджэння дзіцяці. Характэрнай асаблівасцю з’яўлялася тое, што перад замужжам дзяўчына сваімі рукамі вышывала для ўсёй сваёй сям’і кашулі, паясы, ручнікі, каб даказаць, што яна выдатная майстрыха і рукадзельніца. Таму вышыўка з’яўляецца абавязковым атрыбутам сучаснага адзення як каштоўнай спадчыны беларускага нацыянальнага касцюма.

Для таго, каб сучаснай дзяўчыне цалкам адпавядаць этнічнаму стылю ў адзенні, не трэба вялікіх фінансавых выдаткаў, дастакова мець у сваім гардэробе некалькі базавых рэчаў:

– *Блузы і кашулі.* Будуць прыдатныя лёгкія ільняныя кашулі простага крою. Колер тканіны павінен быць абавязкова светлым, ідэальна – белым. Для кантрасту манжэты і каўнер могуць быць упрыгожаны яркай вышыўкай, кветкавымі прынтамі, нацыянальным арнаментам.

– *Трыкатажныя майкі.* Як сучасны элемент ў такім стылі, майкі, пераважна светлых адценняў, могуць дапаўняцца стыльнымі кардыганамі і блэйзерам. Для поўнага «пагружэння» ў стылістыку, майкі таксама могуць упрыгожвацца вышыўкай, арнаментам або аздабляцца яркімі аксесуарамі ручной работы.

– *Спадніца.* Жаночая спадніца павінна быць зручнай, не скоўваць рухаў. Даўжыня спадніцы павінна быць да падлогі або ніжэй каленяў. У якасці аксесуараў можна выкарыстоўваць пояс-кушак з тканіны, аздоблены пацеркамі, дэкарыраваны вышыўкай або аплікацыяй.

– *Сарафан або сукенка.* Іх даўжыня можа быць максі або ніжэй каленяў. Крой павінен быць просты і зручны, з мяккай драпіроўкай, каляровым дэкорам у выглядзе валанаў, залатой тасьмы, арнамента, вышыўкі.

Вырашаючы задачы па стварэнню сучаснага адзення ў нацыянальным стылі, маладыя дызайнеры часта дапускаюць памылкі, у сувязі з чым многія касцюмы пачынаюць нагадваць тэатральныя, а не модныя рэчы, якія маглі б адлюстроўваць самабытнасць народа. Яны больш прызначаны для сцэны, а не для жыцця. На падставе гэтага можна выдзеліць шэраг патрабаванняў, якіх павінны прытрымлівацца дызайнеры пры стварэнні сучаснага адзення ў этнічным стылі:

– запазычванне элементаў, а не дакладнае іх капіраванне;
– выкарыстанне прыемаў стылізацыі;
– выкарыстанне сучасных форм і дэталяў, матэрыялаў;
– арыентацыя на спажыўца;
– веданне народнай сімволікі.

Такім чынам, мадэляванне сучаснага адзення з выкарыстаннем элементаў традыцыйнага беларускага касцюма ўносіць істотны ўклад у распрацоўку новых прынцыпаў і прыемаў мастацкай выразнасці

адзення беларусаў. Стварэнне моднага адзення з выкарыстаннем элементаў нацыянальнага касцюма адзначаецца шматстайнасцю мастацкіх рашэнняў. Апраўданае выкарыстанне розных відаў семіятычных знакаў, знакавых сістэм, адлюстраваных у традыцыйным нацыянальным касцюме, улік іх структурных асаблівасцей, удалае спалучэнне народных элементаў і сучасных матэрыялаў забяспечвае стварэнне арыгінальных мадэляў, заснаваных на гармоніі традыцыйных і сучасных складнікаў.

## РОЛЬ РЕЧКИ ЛОШИЦЫ В ЖИЗНИ ПОЛОЦКОГО КНЯЖЕСТВА

## THE ROLE OF THE LOSHYTSA RIVER IN THE LIFE OF THE POLOTSK PRINCIPALITY

Н. М. Новикова
N. M. Novikova

Белорусский государственный университет
Минск, Республика Беларусь
Belarusian State University
Minsk, Republic of Belarus
*dedal39@mail.ru*

В статье автор рассматривает роль и значение речки Лошицы в истории Полоцкого княжества и на основании сведений из смежных источников создает образ средневекового поселища в период движения викингов. Приводится оригинальная точка зрения современных историков на события зимы 1066—1067 годов.

*Ключевые слова:* Лошица; археология; викинги; шлях «из Варяг в Греки»; язычники; клады; куфический дирхем; волок; Немига.

In this article, the author examines the role and importance of the Loshitsa River in the history of the Polotsk principality and, based on information from related sources, creates an image of a medieval settlement during the Viking movement. The original point of view of modern historians on the events of the winter of 1066-1067 is given.

*Keywords:* the Loshitsa River; archaeology; Vikings; the way «from the Varangians to the Greeks»; pagans; treasures; kufaic dirhem; snaking trail; the Nemiga river.